Кулацкія і антысавецкія элементы разгарнулі контр-рэвалюцыйную агітацыю супроць кантрактацыі яравых, папярэджваньня пасеўных плошчаў, супроць уступленьня ў калгас бяднякоў і сераднякоў. Партыйныя ячэйкі слабо мабілізуюць масы для адпору кулацкай контр-рэвалюцыйнай агітацыі. Кулацтва, карыстаючыся блазьнаватасьцю партыйных ячэек, узмацнае свае пазыцыі, схіляе на свой бок пасобныя, найбольш нястойлівыя элементы беднаты і серадняцтва. Толькі гэтым можна вытлумачыць, што плян кантрактацыі па Віцебскім сельсавеце змаль ні на адным сходзе ня быў прыняты.

Такое становішча з прыняцьцем пляну кантрактацыі і ў іншых сельсаветах. Звычайна на сялянскія сходы, дзе абгаварвалася пытаньне аб плянах кантрактацыі, прыходзілі кулацкія элементы і на сходах праводзілі работу супроць прыняцьця заданьняў па кантрактацыі, як непасільных і т. д. Камуністы і работнікі сельсаветаў, якія прысутнічалі на гэтых сходах, ня досыць рашуча выкрывалі намеры кулацтва і заможнікаў, не паказвалі пярокім масам бяднацка-серадняцкага сялянства, чаму кулацтва шалёна выступае супроць кантрактацыі, не мабілізавалі мас на адпор кулацкай агітацыі, у сувязі з чым плян кантрактацыі ставіці пад пагрозу зрыву.

Былі выпадкі, калі пасобныя савецкія работнікі на весковых сходах выступалі супроць кантрактацыі. Так, у Вараўлянскім сельсавеце міліцыянер Воўкаў, які прыехаў з Віцебску, адкрыта выступіў супроць прыняцьця беднякамі і сераднякамі плану кантрактацыі. Воўкаў сваім выступленьнем выкананьне сацыяльны заказ кулацкага ворага, дапамог кулацтву сарваць прыняцьце плану.

Характэрна, што з 30 старых калгасаў па Віцебскім раёне закантрактавалі свой насеў толькі 10, ні ў адным з новых калгасаў плян кантрактацыі да гэтага часу ашчэ ня прыняты. Ні адзін з калгасаў не перайшоў на зьцэлыцыну.

Апартуністычнае кіраўніцтва раёнсавгасаў, якое ня здольна забясьпечыць сапраўды бальшавіцкай падрыхтоўкі да сяўбы, ня здольна кіраваць і арганізоўваць новы калгасны прыёмі, павінна быць зьнята.

Гарком партыі і гарВК павінны неадкладна прыцягнуць да самай жорсткай партыйнай адказнасьці апартуністаў, якія за ўгоду клясава-варожым элементам зрываюць выкананьне важнейшых дырэктыў партыі.

План кантрактацыі па Віцебскім прыгарадным раёне можа і павінен быць выкананы.

Арн. Зарубежны.

Разважаньні „наогул“, а канкрэтных вынікаў няма

У Глускай раённай партарганізацыі дасьледаецца ўпэўная недаацэнка палітычнага значэньня кантрактацыі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Работа па кантрактацыі, якая пераважна праходзіць самацёкам, ня ўвязваецца з падрыхтоўкай да весьнавой сяўбы, вельмі часта выцякаецца і затушоўваецца работай па выкананьні іншых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў.

Партыйныя ячэйкі не разгарнулі масавай работы сярод бяднацка-серадняцкіх пластоў вёскі, не мабілізаваны ў лежнай ступені масы на змаганьне з кулацтвам, якое вядзе шалёную агітацыю супроць кантрактацыі яравых пасеваў. Кулацтва ўзмоцнена агітуе за адмаўленьне ад кантрактацыі яравых, распускаючы контр-рэвалюцыйную хлусьню аб тым, што ўвесь ураджай сабесьпячэньні, становішчы і разьвіцьці прыгарадных гаспадарак і абкрэ кіраўнічы орган прафсаюзаў Беларусі.

Такім чынам парадак дня зьезду ахапляе асноўныя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва данага перыяду.

Прафсаюзы Беларусі падыходзяць да свайго зьезду з вялікарнымі посьпехамі ва ўсіх галінах будаўніцтва сацыялізму. Рост рабочае клясы БССР, ліквідацыя беспрацоўя, палепшэньне матар'яльнага становішча, шырокі рух сацпаборніцтва і ўдарніцтва, рост новых заводаў і фабрык—вось вынік правільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, жорсткай барацьбы з апартунізмам. Усе гэтыя посьпехі патрабуюць ад прафсаюзаў поўнай перабудовы прафработы ва ўсіх зьвёнках свайго апарату ў адпаведнасьці з задачамі сучаснага перыяду.

Бюро ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце прафсаюзаў Беларусі побач з далатнімі момантамі адзначыла рад недахопаў у перабудове прафапарату, павароту яго тварам да вытворчасьці. Прафсаюзы ў радзе выпадкаў ня здолелі стаць на чале вытворчай актыўнасьці рабочых, не прыцягнулі да практычнай прафработы добраахвотнікаў, не наблізілі сваёй работы непасрэдна да вытворчасьці і г. д.

Пленум гэтага да Усебеларускага зьезду павінна быць ператворана ў масавую бачную праверку стылю перабудовы прафсаюзаў, рэалізацыі пастановы бюро ЦК КП(б)Б і V-га пленуму УсеЦСПС.

Прарывы, якія ёсьць у выкананьні прамфінпляну раду прадпрыемстваў, паказваюць, што да гэтага часу ня ўсюды ашчэ прафработа перабудавана.

У баку ад важнейшай задачы

У падрыхтоўчай рабоце да весьнавой сяўбы на Касьцюковіцкім раёне найбольш буйныя прарывы дапушчаны ў выкананьні дырэктыў партыі па кантрактацыі яравых культур. Многія партячэйкі гэтага раёну амаль нічога не зрабілі для папулярызацыі адозвы СНК і ЦК УсеКП(б) сярод калгаснікаў і аднаасобных бяднацка-серадняцкіх мас, нічога не зрабілі для практычнага выкананьня гэтай дырэктывы.

Кампанія па разгортваньні кантрактацыі ў раёне распачата з вялікім спазьненьнем. Сякія-такія адзнакі работы ячэек у гэтым напрамку па калгасах паказаліся толькі ў сярэдніх лічбах сакавіка, а ў аднаасобным сэктары ня было закантрактавана ні аднаго гектара. З таго часу прайшло тры дэкады, а зруху належнага няма. Апрача таго ў практычнай рабоце па кантрактацыі ў радзе сельсаветаў пануе блытаніна. З боку партарганізацыі няма канкрэтнага кіраўніцтва гэтай справай. Пры даваднёні пасеўных плянаў да двара ў Царыновіцкім, Самацевіцкім і Касьцюковіцкім сельсаветах бяднякам гасподаркам, якія маюць 0,5—1,0 гэкт. плошчы яравога пасеву, вызначалася па 12 розных культур, што зьяўлялася нерэальным і давяло да дыскредытацыі мерапрыемстваў па кантрактацыі.

У радзе населеных пунктаў гэтых сельсаветаў прыняты на сходах пастановы «кантрактаваць па меры магчымасьці». Прынялі такія пастановы і усталяліся. Фармальны падыход да справы кантрактацыі, апартуністычная стаўка на самацёк пануе ў радзе ячэек. Кулацкая агітацыя за зрыў кантрактацыі не сустракае досыць рашучага адпору. У гэтым—асноўная прычына прарываў у рабоце па правядзеньні кантрактацыі.

П-ка.

ПЫТАНЬНЕ АБ КАНТРАКТАЦЫІ

нават не абмеркавана на сходзе парт'ячэйкі

Пачаўся сельсавет у Чашніцкім раёне зьяўляецца самым адсталым сельсаветам па выкананьні гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў у справе падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы і разгортваньні калектывізацыі бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

У сельсавеце калектывізавана толькі 5 процантаў бяднацка - серадняцкіх гаспадарак.

Работа па кантрактацыі яравых да гэтага часу ў сельсавеце ашчэ зусім не распачата. Вялізарныя прарывы ў правядзеньні гаспадарча - палітычных кампаній, у выкананьні дырэктыў партыі аб падрыхтоўцы да сяўбы па калектывізацыі, на правядзеньні кантрактацыі яравых пасеваў тлумачацца выключна тым, што партыйная ячэйка і сельсавет не павярнуліся тварам да задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, не мабілізавалі бяднацка-серадняцкіх мас вёскі, на выкананьне гэтых задач, ня далі адпору кулацтву, якое, змагаючыся з існуючымі ў сельсавеце неякімі кулацкімі, імкнецца зрабіць свой уплыў на частку найбольш нястойлівых элементаў сялянства.

Сакратар партыйнай ячэйкі Мамонкаў у працэсе работы паказаў сваю поўную няздольнасьць мабілізоўваць масы на разгортваньне бальшавіцкай падрыхтоўкі да сяўбы, на правядзеньне кантрактацыі. Наколькі партыйная ячэйка змагла пераключыцца на правядзеньне работы па кантрактацыі сьведчыць той факт, што ячэйка да гэтага часу ні кантрольных заданьняў, ні форм масавай работы на сваім сельсавеце ў правядзеньні кантрактацыі не абгаварыла.

ПРАТАСЭВІЧ.

Закладка парнікоў пад пагрозай

Свячасовае выкананьне пляну закладкі парнікоўных рам цесна зьвязана з палепшэньнем рабочага забясьпячэньня гарадоў.

Паводле пляну сёлета ў калгасах павінна быць закладзена 45.000 парнікоўных рам. Па ўсіх раёнах, дае мяркуецца закласьці парніковыя рамы. Калгасцэнтрам выслана каля 29.000 новых рам.

Факты з месц сьведчаць, што раённыя арганізацыі пытаньню закладкі парнікоўных рам не аддаюць належнай увагі. Наглядзеццяўная недаацэнка значэньня парнікоўлае палепшэньня рабочага забясьпячэньня.

Так, на 1 красавіка па калгасах Менскага раёну замест 9.250 рам закладзена 1.232 рамы або 13 проц. пляну. Гомельскі раён выканаў плян закладкі парнікоў толі на 10 проц., Бабруйскі на 9 проц., Ігенскі—на 4 проц. і Аршанскі — на 18 проц.

Падрыхтоўка работы да закладкі парнікоў праходзіць вельмі марудна. Патрэбнае ўтяленьне не падвозіцца. Так, у калгасах Менскага раёну не хапае для закладкі парнікоў каля 4.800 вазоў гною.

Плян закладкі парнікоўных рам павінен быць выканан да 15-га красавіка. Інакш уся работа па закладцы парнікоў будзе сарвана.

Калгасы павінны поўнасьцю скарыстаць усе парніковыя рамы, якія ёсьць, і забясьпечыць выкананьне пляну забясьпячэньня рабочых раньняй гародзінай.

П—н.

Карныя кандраўцеўшчыны, прышчэпаўшчыны

ЯШЧЭ НЯ ВЫКАРЧАВАНА

Кіраўніцтва Д сельгас. акадэміі праводзіла правааапартуністычную практыку, натуралізуючы клясава-чужыя элементам, ігнаравала дырэктывы партыі аб перабудове работы тварам да задач сацыялістычнай рэканструкцыі

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Беларуская с.-г. акадэмія ў Горках буйнейшая навучальная ўстанова. Гэта вялікі навучальны камбінат, які закладзі навучальнай значную ролю ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР. У акадэміі навучаецца звыш 2.000 студэнтаў.

Факты апошняга часу сыгналізуюць аб тым, што акадэмія, у цэлым, ня ў стане, ня здольна выхоўваць новых пралетарскіх кадры спэцыялістаў сацыялістычнага земляробства.

Ва ўсіх галінах работы акадэміі найбольшыя прарывы, якія патрабуюць безадкладнага ўмяшальніцтва ўсёй парткіраўніцтва і савецкая грамадзкасьць БССР.

Аб становішчы на гэтым важнейшым вучастку падрыхтоўкі кадраў лепш за ўсё сьведчыць наступны факт. З 50 выпускнікоў 3 і 4 курсу факультэту арганізацыі тэрыторыі 25 адмовіліся выключыць са складу акадэміі, як дзяцей кулакоў і былых паровых чыноўнікаў. Кулакі, вораг неяк чынам пралез у рады студэнтаў. Адзін з іх—Ляховіч нават ідэалізуе рабочых, а ня справе аказаўся сынам былога старшыні земскай управы, улаўсніка 3-х дамоў. Другія, як Дзік, Дзятлоў, Раманоўскі, Далецкі — антысаветы, сыны [illegible] ваўкоў, абкладзеных падаткам у [illegible] індывідуальным парадку. З апошняга [illegible] ку культурытэхнікаў у 11 чалавек, [illegible] вылішыўшыя як клясавы [illegible]мент.

[illegible] ыхтавала акадэмія ў якасьці [illegible] палітыкі партыі і ўрада [illegible]стычная рэканструкцыі [illegible]дарскі. Некаторыя з [illegible] чвалі дзяржаўных [illegible]

[illegible] ані становішча [illegible] тэрыторыі. [illegible]ніяном у [illegible]ультуры— [illegible] тарэ [illegible]

[illegible] ыстаўляла акадэмія ў якасьці [illegible] ыкладчыкаў і ўрачоў [

Гарсаветы НА ВЫКАНАЛІ НАКАЗУ ВЫБАРШЧЫКАЎ, не павярнуліся тварам да вытворчасьці

Ажыцьцявіць бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага наступленьня—важнейшая задача савецкага апарату ў рэканструкцыйны пэрыяд.

Масавым рабочым кантролем зьнізу над дзяржапаратам забясьпечым яго карэкнную перабудову.

Савецкі апарат--тварам да задач трэцяга рашаючага

X усебеларускі зьезд Саветаў выразна падкрэсьліў неабходнасьць неадкладнай перабудовы работы саветаў і савецкага апарату, у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Работа саветаў і савецкага апарату,—заявіў зьезд, у рэзалюцыі па справаздачы Ураду БССР,— вызначаецца прынятай партыяй і савецкай уладай лініяй разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элементы.

Узьнімецце ролі саветаў у правядзеньні генэральнай лініі партыі на практыцы зьезд вызначыў, як адну з важнейшых і асноўных задач цяперашняга моманту.

На сёньняшні дзень прыходзіцца, канстатаваць, што савецкі апарат яшчэ не перабудаваў сваёй работы, у адпаведнасьці з задачамі сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва, не пераключыўся яшчэ на тэмпы трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Матэрялы, якія мы сёньня зьмяшчаем і якія амаль кожны дзень друкуюцца на старонках цэнтральных і раённых газэт, паказваюць, што ў некаторых зьвяньнях савецкага апарату яшчэ знаходзяць сабе месца бюракратызм, непаваротлівасьць, расхлябанасьць, а часамі і простае шкодніцтва. Апарат БЕЛМЯСА да апошняга часу быў засмечан чужымі элементамі, якія перашкаджаў выкананьню пастаўленых партыяй задач у галіне мясазагатовак.

Праведзеная праверка і чыстка апарату Белмяса выявіла шмат агідніцтваў у рабоце ўстановы.

У НАРКАМЗЕМЕ да гэтага часу яшчэ пануе неарганізаванасьць унутры цэнтральнага апарату і неналаджанасьць сувязі наркамату з раёнамі. Інспэктары НКЗ, якія выяжджаюць у раёны, не ахапляюць жыцьцём кіраўніцтвам і інструктажам па ўсіх асноўных пытаньнях работы Наркамзему. Пісьмовая сувязь тансама наладжана вельмі дрэнна.

ГАРАДЗКІЯ САВЕТЫ ў большасьці працуюць яшчэ па-старому. За два месяцы, што [illegible] пасьля перавыбораў гарсаветаў, рашучы перапом у іх рабоце яшчэ не наступіў. Гарсаветы яшчэ ня выканалі асноўнага наказу сваіх выбаршчыкаў—не павярнуліся тварам да вытворчасьці, тварам да прамфінпляну. Яркім прыкладам можа служыць Менскі гарсавет. Да гэтага часу гарсавет яшчэ ня здолеў навет арганізаваць на ўсіх буйных прадпрыемствах дэпутацкія групы — гэтыя асноўныя зьвяньні сувязі гарсавету з вытворчасьцю.

Як паведамляла гэтымі днямі газэта «Рабочай», на шэйнай фабрыцы «Кастрычнік», абутковай фабрыцы, на хлебазаводзе і іншых прадпрыемствах арганізацыі дэпутацкіх груп аддаецца вельмі мала ўвагі.

Гарсавет не зядзе растлумачальнай работы аб важнасьці і задачах дэпутацкіх груп, аб іх ролі на прадпрыемствах і г. д. Ня дзіўна, што старшыня заўкому хлебазаводу лічыць зусім непатрэбным арганізацыю дэпутацкай групы на заводзе, бо «ў нас усяго 3 дэпутаты». Ён лічыць, што ў дэпутацкай групе павінны працаваць выключна члены гарсавету і не разумее, што ў гэтай рабоце могуць і павінны прымаць актыўны ўдзел лепшыя рабочыя ўдарнікі—ня члены савету.

Там, дзе дэпутацкія групы арганізаваны, яны фактычна існуюць толькі на паперы. Жывой сувязі і сыстаматычнага кіраўніцтва з імі гарсавет не наладзіў.

Сэкцыі гарсавету яшчэ не разгарнулі, як належыць, сваёй работы, з 14 сэкцый толькі 3—сэкцыя аховы здароўя, каапэрацыйная і сельска-гаспадарчая—працуюць больш-менш здавальняюча. Рэшта-ж амаль не прыступіла да практычнай работы.

Амаляёгічнае становішча мы маем і ў ВІЦЕБСКІМ гарсавеце. Там таксама аддаецца мала ўвагі сувязі з вытворчасьцю, арганізацыі дэпутацкіх груп на прадпрыемствах. На новай шэйнай фабрыцы, на чыгунцы і інш. дэпутацкія групы дагэтуль яшчэ не арганізаваны. Ня ўсе сэкцыі Віцебскага гарсавету разгарнулі сваю работу. Рэдкі сэкцый фактычна бязьдзейнічае. Масавая работа на прадпрыемствах гарсаветам не разгорнута.

Патрэбен рашучы перапом. Гарсаветы павінны неадкладна прыступіць да выкананьня наказу сваіх выбаршчыкаў, да карэннай перабудовы сваёй работы. У першую чаргу трэба рашуча павярнуць работу гарсавету тварам да вытворчасьці, да прамфінпляну, да задач трэцяга рашаючага. Арганізаваць на ўсіх буйных прадпрыемствах дэпутацкія групы, учэпіцца ў іх работу лепшых рабочых ударнікаў, наладзіць сыстаматычную сувязь і кіраўніцтва імі,—вось шлях, на які павінны неадкладна стаць усе гарсаветы.

Задачы сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы ў прыгэрадных сельсаветах павінны стаць у цэнтры ўвагі гарадзкіх саветаў.

Пастановы X усебеларускага зьезду саветаў аб перабудове савецкага апарату павінны быць шырока папулярызаваны сярод рабочых і працоўных мас.

У сьвятле гэтага набывае асабліва важнае значэньне арганізацыя сыстаматычнага штодзеннага рабочага кантролю зьнізу над савецкім апаратам. Месячнік праверкі і арганізацыі шэфства над дзяржаўным апаратам даў некаторы эрух у нападжваньні масавага пралетарскага кантролю над работай савецкіх устаноў. Дасягненьні месячніку павінны быць замацаваны.

Пачын „Камунара Магілеўшчыны"

Рэдакцыя газэты «Камунар Магілеўшчыны» ўключылася ў паход за паварот гарадзкіх саветаў тварам да вытворчасьці. З гэтай мэтай рэдакцыя прыступае да арганізацыі рабкораўскіх пастоў-брыгад на прадпрыемствах, дзе будуць арганізаваны дэпутацкія групы. Рэдакцыя абавязваецца шырока асьвятляць на старонках газэты практыку работы дэпутацкіх груп і сацыялістычнай сумяшчальнасьці.

Рэдакцыя выклікае на спаборніцтва на лепшы ўдзел у перабудове работы Саветаў бабруйскую газэту «Камуніст» і аршанскую—«Ленінскі прыклад».

Агысьцім мясазагатоўчы апарат ад „чужакоў"

Праверка работы апарату Белмяса выявіла засьмечанасьць мясавых зьвяньняў аб'яднаньня чужымі элементамі, былымі гандлярамі, пазбаўленымі права голасу і г. д.

Гэтыя чужыя элементы перашкаджалі разгортваньню масавай работы сярод загатовак, пагрозлі кулацтву, дапамагалі кулацка-заможным гаспадаркам ня выконваць цвёрдых заданьняў.

На Мазырскім пункце Белмяса панавала бесгаспадарчасьць. Жывёлу трымалі на дваре, пад адкрытым небам, часта не хапала вады пайць кароў. Будаўніцтва на пункце праводзілася бесплянава, бяз улику патрэб.

Сьвіназгодкармачныя пункты знаходзяцца ў антысанітарным становішчы, кармы падаюцца несвяжатасова, старшыя рабочыя не адпавядаюць свайму прызначэньню. Бойня таксама аналогічна ў антысанітарным становішчы. У камерах бойні валяюцца розныя адкіды.

Пляны загатовак за першы квартал на выкананы, у асобнасьці, пляны загатовак сьвіней. Загадчык Мазырскага пункту Белмяса Белы ня выконваў дырэктыў, а наадварот тармазіў іх правядзеньне. Партыйныя арганізацыі своечасова ўдарылі па шкодніцтве на пункце. Зьнята кіраўніцтва. У часе чысткі выгнаны з апарату ўсе чужыя элементы.

Новае кіраўніцтва узялося за ліквідацыю прарываў.

З-н.

Змагайцеся запяршынства

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету т-ва «Праф пісьменнасьць» абвясьціў конкурс на лепшы ўдзел раённых і гарадзкіх саветаў, ячэек, членаў таварыства культармейцаў - ударнікаў у правядзеньні другога этапу культэстафэты.

Тэрмін конкурсу вызначаны з 1-га красавіка па 1 ліпеня г. г. Конкурс мае сваёй мэтай спрыяць шырокай мабілізацыі працоўных мас па барацьбу за будаўніцтва пралетарскай культуры. Трэба дамагчыся таго, каб удзельнічаньне саветаў, ячэек і культармейцаў - ударнікаў у гэты конкурс мела шырока-грамадзкі характар. Конкурс дасьць магчымасьць перанесьці вопыт перадавых арганізацый таварыства ў справу культурнага будаўніцтва ў тыя арганізацыі, якія пакуль што ганебна адстаюць (напрыклад, Віцебск), а таксама на грунце сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ўзьняць баяздольнасьць усёй культармеі.

Агульнае кіраўніцтва конкурсам належыць усебеларускаму журы ў складзе прэзыдыуму цэнтральнага савету т-ва «Праф пісьменнасьць», прадстаўніка Наркамасьветы, ЦСПСВ, ЦК ЛКСМБ ад штабу культэстафэты і ад рэдакцый газэт «Зьвязда» і «Савецкая Беларусь».

Для кіраўніцтва і ўстанаўленьня пастаяннага кантролю над удзелам ячэек і членаў таварыства ў конкурсе пры райгарсаветах «ПН» складаюцца раённыя камісіі.

Камісіі разгортваюць агітацыйна-растлумачальную работу па ўцягненьні ўсёй арганізацыі ў конкурс. Яны павінны скарыстаць усе формы і мэтады для збору найбольш шырокага і поўнага матэрялу аб рабоце ячэек і культармейцаў - ударнікаў, членаў таварыства «ПН». Для гэтага камісіям трэба праводзіць адпаведныя сходы, канфэрэнцыі, нарады, зьлёты і г. д.

Раённыя камісіі павінны арганізаваць конкурсы ў раённым маштабе, для чаго складаецца раённы прэміяльны фонд.

Прэміяваньне будзе праводзіцца на грунце абсьледаваньня раёнаў і ячэек, газэтнага матэрялу, пасьля заслухоўваньня справаздач пасобных арганізацый на пасяджэньнях прэзыдыуму цэнтральнага савету, шырокай інфармацыі з месц і паводле матэрялаў раённых і гарадзкіх конкурсаў.

Пры абгаварэньні кандыдатур для прэміяваньня будуць прымацца пад увагу лепшыя колькасныя паказальнікі росту ячэек і членаў т-ва, мабілізацыі культактыву, стопроцантнага ахопу пісьменных і малапісьменных лікпунктамі, стопроцантнага наведваньня заняткаў у лікпунктах і зьнішчэньня адсеву.

Па якасных паказальніках: перабудова работы саветаў і ячэек таварыства адпаведна задачам сацыялістычнага будаўніцтва, перакліканьне тэмпаў работы на ударныя, бальшавіцкія тэмпы.

Удзел таварыства, кожнага члена яго і лікпунктаў у гаспадарча-палітычных мерапрыемствах, што праводзяцца партыяй і ўрадам (прамфінплян, калектывізацыя, веснавая сяўба, загатоўкі, мабілізацыя сродкаў, паход за тэхніку, палітэхнізацыя школ, усеагульнае навучаньне і інш.).

Увядзеньне і лепшае правядзеньне палітычных, тэхнічных і агранамічных гадзін, правядзеньне антырэлігійнага і інтэрнацыянальна - клясавага выхаваньня на лікпунктах.

Разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, увядзеньне сустрэчных плянаў у рабоце таварыства «Праф пісьменнасьць» і лікпунктаў.

Удзел тых, што навучаюцца на лікпунктах, у грамадзкую работу і масавае культпалітасьветнае абслугоўваньне іх.

Актывізацыя метадаў навучаньня і дапамога пісьменным ва ўсваеньні матэрялаў.

Найлепшы ўдзел у правядзеньні астатніх маршрутаў другога этапу культэстафэты ў галіне якасных паказальнікаў.

Прэміі вызначаны наступныя: для райгарсаветаў — першая прэмія коштам у 200 рублёў (радыё-ўстаноўка з запаснымі прыладамі), другая — 150 р. (радыё-ўстаноўка) і трэцяя—100 руб.

Для ячэек таварыства — 5 прэмій на суму ад 100 да 30 рублёў, на разгортваньне работы.

Для культармейцаў - ударнікаў вызначана 10 прэмій, куды ўваходзяць 50-процанты экскурсійны літар і 60 рублёў грашыма для экскурсіі, гарнітур, насьценны гадзіньнік, месца ў доме адпачынку, поўны збор твораў Леніна, бібліятэчка.

Саветы і ячэйкі таварыства «ПН», культармейцы - ударнікі, змагайцеся за першынства. Памятайце словы Леніна аб тым, што «ў краіне пісьменнай і некультурнай камуністычнага грамадства пабудаваць нельга».

У балоце блытаніны і неарганізаванасьці

Пашэрэнае абсьледаваньне апарату Наркамзему БССР выявіла поўную неналаджанасьць сувязі наркамату з раёнамі і неарганізаванасьць работы ўнутры самога цэнтральнага апарату.

Для жывой сувязі з раёнамі ёсьць 6 інспэктароў, якія выяжджаюць у раёны або па вузка-спэцыяльных пытаньнях свайго сэктару (рэвізоры па земляўпарадкаваньні) або па розных выдавоных заданьнях і не ахапляюць у раёне комплексу асноўных пытаньняў наркамземаўскай работы. Бясьсістэмасьць жыцьця інструктажу дае ў выніку вельмі малы эфэкт і некатэгорнае скарыстаньне кваліфікаваных інспэктарскіх кадраў. Выезды інспэктараў НКЗ і сыстэм НКЗему паміж сабой ня ўзгаданы і ня ўзгоднены.

Ня лепш стаіць справа і ў адносінах пісьмовай сувязі: на месцы даюцца няўзгодненыя паміж сабою апэрацыйныя паказаньні па адных і тых-жа пытаньнях НКЗемам, Калгасцэнтрам, трыма сыстэмамі с.-г. каапэрацыі і трэстамі. Так, напрыклад, высьветлілася, што па пытаньні работы з беднотой раёны атрымлялі з рэспубліканскага цэнтру на 3-4 розныя дырэктывы ад розных сыстэм.

Не разьмежаваны функцыі ўнутры наркамату паміж сэктарамі і ў сэктарох паміж супрацоўнікамі; у штодзённай рабоце панае блытаніна і неразьбярыха.

Няма поўнай метадалёгіі ў плянаваньні разьвіцьця сельскай гаспадаркі; плянаваньне вядуць па сваіх галінах пасобныя сэктары. Ня высьветлена роля інстытуту рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў галіне плянаваньня.

Усё гэта сьведчыць, што пытаньні арганізацыі працы ў НКЗ не адпавядаюць патрабаваньням і тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва. Патрэбен рашучы пералом.

А. Чыжэўскі.

Дзьве сілы.

Звыш праграмы пошта Пач. у 7 г., гукавы фільм 8 г. 45 м. і 10 гадз. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура" — Старац Васіль Гразноў. Хроніка № 13. Пач.: 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал" — 2-гі тыдзень 2-гі. Гістарычны фільм Ледзяны дом

Кіно „Пралетарый" — 1) ПАТ і ПАТАШОН у лепшай камэдыі ў 7 част. ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ. 2) ЗМЯЖНЫ ПЯХОД у 2 ч. Пачатак у 6 г.

Кіно „Юны Піянэр" — ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ кіно-п'еса ў 6 част. Кіно-хроніка № 16. Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня. Каса—з 11 г. 30 м.

Кіно „Спартак" — З панядзелка, 13 красавіка 2-гі тыдзень 2-гі. Чакайце другое жыцьцё. Драма ў 8 частках. Пач.: 7 г., 9 г., і 10 г. 45. Каса—з 5 гадз.

Аргбюро ЦСПСБ саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў паведамляе, што

І-шы Ўсебеларускі зьезд фінансава-банкаўскіх работнікаў

АДКРЫВЕЦЦА 14 КРАСАВІКА г. г. у 7 гадз. увечары ў памяшканні клюбу Саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай).

Францыя зьезду абсудзецца ў 5 гадз. веч. у гэтым-жа помешканьні. Рэгістрацыя дэлегатаў і выдача мандатаў праводзіцца 13 і 14 красавіка з 10 гадзін раніцы да 4-х і з 6—8 у памяшканьні саюзу СГС.

369

Даводзіцца да ведама ўсіх таварышоў, якія залічаны на пэдфак БДУ ў восьмы набор і не зьявіліся к 10-IV па заняткі, што ў выпадку іх няўкі ДА 20-IV—31 г. яны БУДУЦЬ ВЫКЛЮЧАНЫ з ліку студэнтаў і на іх месца будуць залічаны кандыдаты.

879

МЦРК сумесна з ГАРЖЫЛСАЮЗАМ на 14 красавіка, у 7 гадз. веч., у клюбе друкароў (Ленінская, 13) склікае

СХОД ЖАНЧЫН-РАБОТНІЦ

прадпрыемстваў і ўстаноў, жонак рабочых і служачых, якія жывуць у дамах ЖЭКТа ў г. Менску, па пытаньні: вясновая пасеўкампанія і ўдзел у ёй жанчын.

Пасьля сходу—мастацкая частка.

На сход запрашаюцца ўвесь мэнпастыў, і жан.-дэлегаткі гарсавету.

Аргмасавы сэктар МЦРК. Гаржылсаюз.

378

Менская гарадзкая ашчадная каса

даводзіць да ведама ўсіх працоўных, што

ПРЫЁМ НАЯЎНЫМІ ГРАШЫМА

ЗА КАМУНАЛЬНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ (квартплата, Эльвод і г. д.) з 15-га красавіка г. г. будзе праводзіцца наступнымі аддзяленьнямі ашчадкасы:

5 аддзяленьне (вул. 1-я Лекерта)
198 „ (Савецкая вул. 185)
200 „ (Камунальная, 51)
15 каса (пасажырскі вакзал пры пошце)
17 „ (Масюўская, 36, пры пошце).

Іншыя касы гораду апэрацыі па прыёме квартплаты, Эльводу і г. д. з 15-красавіка г. г. наяўнымі грашыма не праводзяць, а выключна безнаяўныя разьлікам, шляхам сьпісаньня з рахункаў.

Даведкі ў ашчадкасах.

338 Менгарашчадкаса.

Праектна-канструктарская кантора БУДАБ'ЯДНАЬНЯ ВСНГБ

даводзіць да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў, што яна прымае сябескладаньне зэкізных праектаў, распрацоўку канструкцый і разьлікаў, рабочых чарцяжоў і каштарысаў на фабрычна-заводзкія і гарадзкія пабудовы для будаўнічых работ як на 1931 г., так і на 1932 год.

АДРАС: Менск, Розалюцыйная, 3, праектна-канструктарская кантора Будаб'яднаньня.

316

ЗАПАМЯТАЙЦЕ ЎСЕ,

хто выпісвае газэту „ПРАВДА" і яе выданьні, што, каб унікнуць затрымкі ў высылцы газэт і часопісяў „ПРАВДЫ", прапануецца падпіску здаваць выключна пошце або ліст-аносцам НЕ ПАЗЬНЕЙ 20-га числа перад падпісным месяцам.

ПАДПІСКА, накіраваная непасрэдна ў галоўную кантору выдавецтва „Правда", ВЫКОНВАЦЦА НЯ БУДЗЕ

№ 75—18-III Выдавецтво ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА".

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІТЭКТУРНА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае ПРЫЁМ студэнтаў НА 1-шы КУРС ТАХНІКУМУ.

Прыйма будзе 40 асоб.

Прыём заяў з 15 па 25 красавіка г. г. штодзенна у канцылярыі тэхнікуму (Менск, вул. Карла Маркса, д. № 37) з 9 да 4-х гадзін.

Пачатак заняткаў 5-га мая г. г.

Правы прыёму ў даведніку НКК, выдадзеным у мінулым годзе.

363

Не падставе пастановы Аршанскага гарсавету ад 19-II—31 г., зацьверджанай ВСНГ БССР,

маст. майстэрня Аршанскага гаркамбінату перайменавана

Ў МЭХАНІЧНА-ЧЫГУНА-ЛІЦЕЙНЫ ЗАВОД „ЧЫРВОНЫ БАРАЦЬБІТ"

380 Адрас: г. Ворша, вул. Энгельса № 53.

ЛІКВІДАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ саюзу камунальнікаў

даводзіць да ведама ўсіх запікаўленых асоб і арганізацый, што ў сувязі з рэарганізацыяй саюзу

УСЕ ПРЭТЭНЗІІ,

якія ёсьць да гэтага саюзу, павінны быць прад'яўлены да 15 красавіка 1931 г., пасьля якога числа ніякія прэтэнзіі здаволены ня будуць.

367 Ліквідком.

Менгарнамітэт узеамадзяючых

даводзіць да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў, што з 5 красавіка АДКРЫТА АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЛЯ ПАКАВАНЬНЯ розных грузаў і мэблі

АДРАС: Нова-Масюўская, 29, тэлеф. 16-89

324

МЯНЯЮ кватэру-асабняк у Новабеліцы (вул. Сталіна, 19) на кватэру з 2-х пакояў у Менску. Зварачацца па адрасах: Новабеліца, вул. Сталіна, 19, да 9 гадзін раніцы Менск, Савецкая, 63, „Рабселькор", тэл. 5-25, Чарнякоў.

ЗГУБЛЕНА круглая ПЯЧАТКА племясаўгаса імя Камінтэрну (б. Русінавічы-Марыупаль).

Лічыць несапраўднай.

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ 1 р. 1 дакуманту

МЕНСК

У Менгарсавеце

— Гарсавет пастанавіў прымацаваць прадпрыемствы і ўстановы Менску да асобных прыгарадных саўгасаў і калгасаў для аказаньня апошнім пастаяннай працоўнай дапамогі. Дапамога будзе насіць характар плянавага вылучэньня адпаведнай колькасьці працоўных гораду для работы на агародах саўгасаў і калгасаў. За аказаньне дапамогі калгасы будуць аплачваць натурай — гародніной. Пры гарсавеце будзе створаны «штаб працоўнай дапамогі» з прадстаўнікоў ЦСПСВ, Гарсавету, райкалтасаюзу, ЦРК і Белсельтрэсту.

— Прэзыдыум гарсавету пастанавіў рэарганізаваць жыльлёва-будаўнічую сэкцыю гарсавету ў дзьве самастойныя сэкцыі: жыльлёвую і будаўнічую.

— Гарсавет зацьвердзіў праект пабудовы ў Менску санітарнай станцыі. Станцыя будзе будавацца на рагу Камунальнай і Пралетарскай вуліц. Пабудова закончыцца вясной 1932 году.

— Да 15 мая ў Менску і прыгарадным раёне будзе адкрыта 70 дзіцячых устаноў (сады, пляцоўкі, ясьлі і г. д.).

— Гарсавет пастанавіў аказаць грамадзкім харчаваньнем усіх рабочых саўгасаў і калгаснікаў прыгараднага раёну. Арганізацыя харчаваньня ў саўгасах ускладзена на райспажыўсаюз, у калгасах—на райкалтасаюз і ў гаспадарках МЦРК—на МЦРК. Уся работа павінна быць закончана не пазьней 20 красавіка. Прапагавана МЦРК, райспажыўсаюзу і райкалтасаюзу арганізаваць пры сталоўках адкормачныя пункты з тым, каб з ліпеня забясьпечваць гэтыя сталоўкі мясам улаонага адкорму.

Падрыхтоўка да першамайскіх сьвят

ЦС Асоавіяхіму БССР разаслаў усім сваім арганізацыям лёт аб правядзеньні першамайскіх сьвят.

Усе асоавіяхімаўскія арганізацыі да 1 мая павінны падагуліць вынікі сваёй работы, прыстасаваць вышэйкі гурткоў па вазушкаці, скарыстоўваючы гэта для шырокай вярбоўкі ў гэтыя гурткі новых членаў Асоавіяхіму.

1 мая Асоавіяхім арганізуе вечары валізкаці, мабілі, фізкультурныя гурткі. Гэты дзень будзе таксама выкарыстан для раскладаньня білетаў 5-й лётарэі Асоавіяхіму і вайсковай літаратуры.

Усебеларускі зьезд рабочых чыгуначнага, партовага і шасэйнага будаўніцтва

10 красавіка ў клюбе саўгандальслужачых адкрыецца першы ўсебеларускі зьезд саюзу рабочых чыгуначнага, партовага і шасэйнага будаўніцтва. У гапаровы прэзыдыум зьезду выбраны т.т. Сталін, Молатаў, Каганові, Капінін, Варашылаў, Кіраў, Касіёр, Рудзутак, Арджанікідзэ, Куйбышаў, Андрэеў, Ленскі, Максім Горкі, Швернік, Закапайла, Гей, Шаранговіч, Рыжоў, Гападзеў, Капнін.

З дакладам аб задачах саюзу ў сувязі з пастановай V пленуму УсеЦСПС аб разбуйненьні саюзаў выступіў старшыня аргбюро ЦСПСВ тав. Плотнін.

З прывітаньнем зьезду выступілі т. Шэйнікаў (М-скі ўдарны стралковы полк), Партноў (дарожны інстытут), Фурман (ІТР Галоўдартрасу БССР), Глонці (аргбюро УсеЦСПС саюзу рабочых чыгуначнага, партовага і шасэйнага будаўніцтва БССР).

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і аргбюро УсеЦСПС саюзу рабочых чыг., партовага і шасэйнага будаўніцтва.

Бабруйскія фізкультурнікі ўзнагароджаны пераходным прызам ЦВК БССР

Прэзыдыум ЦВК БССР узнагарадзіў Бабруйскую фізкультурную арганізацыю пераходным прызам ЦВК БССР за прыкладную масавую грамадзка-палітычную работу, праробленую фізкультурнікамі ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і ўсебеларускай лыжнай эстафэты «працоўных дасягненьняў і гатоўнасьці да абароны краіны».

НА ДАПАМОГУ БАРАЦЬБІТОМ РЭВАЛЮЦЫІ У КРАЁХ КАПІТАЛУ

Уносяць і выклікаюць

Горацкі саюз мэдсанпрацы і сувязі ўносіць на карысьць палітзьняволеных капіталістычных краін 80 руб. і выклікае іншыя саюзы Горацкага раёну на сацспаборніцтва.

— У адказ на крывавы тэрор польскага фашызму ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне, студэнты школы прафруху сабралі на карысьць палітзьняволеных 149 рублёў.

— На крывавы тэрор польскага фашызму ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне раённы камітэт МОПР'у у Лепельне адказвае ўзносам 300 руб. Апрача таго ячэйкай МОПР'у пры Пятрыкоўскім дапасешным пункце быў пастаўлен спэктакль і выручаная сума ў 139 руб. і 35 кап. унесена на дапамогу палітзьняволеным.

— Агульны сход рабочых, служачых, калгаснікаў і сялян - аднаасобнікаў ст. Вобалі сабраці і ўнесьлі на карысьць палітзьняволеных 163 руб. 97 к.

— Дэлегаты камуны «ЯСНЫ ДЗЕНЬ» Талочынскага раёну на карысьць барацьбітоў рэвалюцыі адлічылі свой аднаадзаенны заработак.

Вывазка каменьня—на апошнім пляне

Дарожнае будаўніцтва ў Асьвейскім раёне дрэнна забясьпечана будаўнічымі матэрыяламі. Мясцовыя арганізацыі недаацэньваюць работу па вывазцы каменю. Асьвейскі райвыканком выдаў, праўда, пастанову аб вывазцы каменю, але як гэта пастанова выконваецца — не праверыў. РВК навет ня вылучыў брыгад на дапамогу Галоўдартрасу ў арганізацыі вывазкі каменю. РВК зусім не рэагуе на тое, што Асьвейская арцель «Транспартнік» мала натружана работай, а ад возкі каменю адмаўляецца.

Работжэла разьмеркавана дрэнна. Некаторыя арганізацыі (арцелі Сампрамсалоку і саўгасы) не скарыстоўваюць замацаваных фурманак.

Замест патрэбных 1.500 фурманак працуе толькі 266. Заданьне па вывазцы каменьня выканана на 38,8 проц.

Аўсяньнікаў.

Папраўка

У 6 пункце пастановы СНК БССР аб ажыцьцяўленьні крэдытнай рэформы, зьмешчанай у «Зьвязьдзе» ад 12-га красавіка, укралася апячатка.

Напісана: «Прапанаваць усім гаспадарчым і каапэрацыйным арганізацыям ...падаць Дзяржпляну не пазьней 18 красавіка заяўкі». Павінна быць: «Падаць Дзяржбанку».

Мясапрадукты—рабочым цэнтрам

АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАВІЛЬНУЮ АДГРУЗКУ СКАЦІНЫ

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ПА-ЗАПЛЯНАВЫМ ВЫДАТКАВАНЬНЕМ МЯСАПРАДУКТАЎ

Выканаць плян укамплектаваньня стада жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў.—абавязак усіх загатоўчых арганізацый у другім квартале

Барацьбу за мяса--на баявыя тэмпы

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прапанаваў усім партыйным і савецкім арганізацыям дабіцца выкананьня да 1 красавіка 70 проц. гадавога пляну загатовак жывёлы.

Нядаўна на калегіі Наркамснабу СССР абмяркоўваліся папярэднія вынікі ажыцьцяўленьня пляну загатовак.

Калегія адзначыла, што дырэктыва пленуму наогул выканана, да 1 красавіка загатоўлена каля 67-68 проц. гадавога пляну.

Не першым месцы па загатоўках ідуць раёны суцэльнай і масавай калектывізацыі, найгоршыя вынікі далі раёны з нізкім процентам калектывізацыі.

Зусім нездавальняюча прайшлі загатоўкі сьвіней—каля 17 проц. гадавога заданьня.

Гэтыя першыя посьпехі мясазагатовак, дасягнутыя дзякуючы правільнаму провядзеньню пастаноў пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, папаўненьню апарату Саюзмяса новымі партыйнымі кадрамі, актыўнай дапамозе мясцовых арганізацый, забясьпечыці бесьперабойнае забясьпячэньне мясам асноўных рабочых цэнтраў, стварэньне мясных рэзэрвоў у першым квартале і значныя посьпехі ў галіне разгортваньня сацыялістычнай базы жывёлагадоўлі.

БССР значна адстала ў выкананьні гадавога пляну загатовак жывёлы.

На 1 красавіка загатоўлена каля 55 проц. Такім чынам, заданьне партыі недавыкавана на 15 проц.

Гэта зьявілася вынікам лёгкай недаацэнкі значэньня цвёрдых заданьняў па жывёле кулацка-заможным гаспадаркам, як метаду наступленьня на капіталістычныя элементы вёскі. У радзе раёнаў дапушчаны яўны недаўлік кулацка-заможных гаспадарак, (Туравічы, Лепьчіцы, Касьцюковічы), даны паменшаныя заданьні, ня ўжыты меры дасягненьня цвёрдых заданьняў.

Важнейшая задача загатоўчых арганізацый ДАБІЦЦА ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ЦВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ШЛЯХАМ АДПАВЕДНАГА НАЦІСКУ НА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНУЮ ВЕРХАВІНУ ВЁСКІ.

Калегія Наркамснабу СССР паставіла перад органамі Наркамснабу, Саюзмяса, жывёлагадоўчай каапэрацыяй і Цэнтрасаюзам наступныя задачы ў галіне загатовак жывёлы:

— ЗАХАВАНЬНЕ ДАСЯГНУТЫХ ТЭМПАЎ ЗАГАТОВАК; ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ДРУГОГА КВАРТАЛУ І НЕДАВЫКАНАНАЙ ЧАСТКІ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ.

— ПАЛЯПШЭНЬНЕ ХАВАНЬНЯ ЗАГАТОЎЛЕНАГА МЯСА.

— РАШУЧАЯ БАРАЦЬБА З ПА-ЗАПЛЯНАВЫМ ВЫДАТКАВАНЬНЕМ МЯСАПРАДУКТАЎ.

— ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ АДГРУЗКІ ЖЫВОЙ ЖЫВЁЛЫ І АДКОРМУ.

— ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЎКАМПЛЕКТАВАНЬНЯ СТАДА ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ.

Другі квартал павінен быць шырока скарыстаны для максымальнай здачы жывёлы сацыялістычнаму сэктару, і ў першую чаргу жывёлагадоўчым саўгасам для таго, каб гэтыя фабрыкі мяса ўжо ў будучым годзе пачалі даваць прадукцыю для забясьпячэньня рабочых цэнтраў.

Адна з баявых задач—ДАБІЦЦА ЗЬМЯНШЭНЬНЯ СТРАТ ПРЫ ПЕРАВОЗЦЫ І ЗАБОІ ЖЫВЁЛЫ.

Трэба аддаць самую сур'ёзную ўвагу ўкараненьню гаспадарчага разрахунку ва ўсёй рабоце па загатоўках і пераапрацоўцы мяса.

Дырэктыва выканана

Прыклад бальшавіцкай работы

ПОЛАЦАК. Гадавы плян мясазагатовак па Полацкім раёне на 1 красавіка выканан на 86,3 проц. Дзякуючы сваячасоваму давядзеньню пляну да кулацка-заможных гаспадарак і прыхуваму націску на кулацкія элемэнты, удалося дабіцца поўнага выкананьня цвёрдых заданьняў.

Гадавыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам складаюць 22 проц. агульнага пляну загатовак па раёне.

Сацыялістычны сэктар укамплектаваны стадам у разьмеры 81 проц. гадавога пляну. Поўнасьцю ажыцьцёўлены плян кантрактацыі цялят —1100 штук.

Калгасны сэктар па буйной рагатай жывёле выканаў на 129 проц. гадавое заданьне.

Старшыня сельсавету тармазіць загатоўкі

ТАЛАЧЫН. (Наш кар.). Камісія садзейнасьці мясазагатоўкам пасёлку Лаўрыновічы, Радомскага сельсавету, прапанавала замоўніку Пшыгоцкаму здаць адну карову. Старшыня сельсавету Яцкевіч, які п'янствуе разам з Пшыгоцкім, самавольна скасаваў пастанову камісіі садзейнасьці і даў Пшыгоцкаму магчымасьць прадаць карову на вольным рынку. Факт продажу выведаны, што гэта карова была лішняй у гаспадарцы.

Такі ўчынак члена партыі Яцкевіча зьяўляецца злачынным і зрыў недапушчальным.

БОКА.

Ці варта пасылаць такіх брыгадзіраў

Для ўзмацненьня ходу загатовак жывёлы Белкаапсаюз паслаў Барэзінскі раён брыгадзіра Амбурга. Ён было даручана правесьці масавую работу, растлумачыць селянам значэньне задачы мяса і кантрактацыі малакадаючыцаў на кулака і г. д.

Быў праведзен рад сходаў, якія праходзілі вельмі жвава, на іх кулацкія падпявалы імкнуліся сарыць прыняцьце самаабавязацельстваў.

Многія з прысутных пісьлі брыгадзіра—«прадстаўніка з Менску»—даць устаноўку па загатоўках растлумачыць шмат незразумелых пытаньняў, бо «каму лепш ведаць, як не інтравіку».

Але «прадстаўнік цэнтру» Амбург, як забраўся ў куток, увесь час маўчаў, пакуль ня скончыўся сход.

Нельга траціць грошы на пасылку такіх брыгадзіраў.

БЯРОЗА.